ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 2 (922) | АЎТОРАК, 11 лютага 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## У ГОНАР ПРАФЕСІЙНАГА СВЯТА

26-га студзеня ў нашай краіне ў чацвёрты раз адзначаўся Дзень беларускай навукі. Да гэтай даты Савет рэктараў ВНУ Гомельшчыны і абласное аддзяленне Беларускага прафесарскага сходу выпусцілі і размножылі афішу з віншаваннямі да ўсіх навукоўцаў з нагоды іх прафесійнага свята.

Асноўная падзея адбылася 28 студзеня ў памяшканні Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. Тут сабраліся прадстаўнікі ўсіх шасці ВНУ нашай вобласці, вучоныя і супрацоўнікі навукова-даследчых інстытутаў, каб ва ўрачыстай абстаноўцы павесці размову аб тым, з якімі дасягненнямі навукоўцы сустрэлі сваё свята, над якімі задачамі і праблемамі цяпер больш плённа трэба працаваць.

Уступным словам сход адкрыў старшыня прэзідыума абласнога аддзялення Беларускага прафесарскага сходу, прарэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту прафесар С.В.Шчарбакоў.

З дакладам выступіў рэктар нашага універсітэта, старшыня Савета рэктараў ВНУ Гомельшчыны член-карэспандэнт АН Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі Л.А.Шамяткоў. Леанід Аляксандравіч з належнай паўнатой ахарактарызаваў здабыткі вучоных усіх ВНУ вобласці, акадэмічных навукова-даследчых інстытутаў, сельмашаўскіх канструктараў, якім прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь за 1996 год.

Прамоўца прывёў шматлікія факты і прыклады, якія сведчаць аб няўхільным росце навуковага патэнцыялу Гомельшчыны. Гэта не толькі абароны кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, фундаментальныя даследаванні, але і пашырэнне радоў акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі навук краіны, галіновых акадэмій.

Найбольшая ўвага ў дакладзе была ўдзелена апошнім дасягненням нашага універсітэта як флагмана адукацыі і навукі Беларускага Палесся. Леанід Аляксандравіч называў прозвішчы тых, хто заслугоўвае самай вялікай удзячнасці за сваю шматгадовую педагагічную і навуковую дзейнасць.

Удзельнікаў урачыстага сходу павіншаваў з прафесійным святам і пажадаў новых поспехаў у іх высакароднай справе намеснік старшыні аблвыканкома А.М.Ярчак. Групе вучоных ён уручыў Ганаровыя граматы абласнога Савета дэпутатаў за найбольш значны ўклад у айчынную навуку. Ад нашага універсітэта яе ўдастоены доктар педагагічных навук, прафесар, акадэмік АН Беларусі, загадчык кафедры педагогікі І.Ф.Харламаў.

Свой падарунак удзельнікам сходу зрабілі акцёры абласнога драматычнага тэатра. У іх выкананні была паказана камедыя ў 2-х дзеях па п'есе А.Астроўскага "Лес".

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У перадапошні дзень студзеня адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта. На гэты раз, акрамя яго членаў, на абмеркаванне пытанняў, вынесеных на парадак дня, былі запрошаны загадчыкі кафедр, кіраўнікі структурных падраздзяленняў ГДУ.

Першай выступіла галоўны бухгалтар І.А.Курава. Яна праінфармавала аб выніках фінансавай дзейнасці універсітэта за 1996 год. Іраіда Антонаўна адзначыла, што ў цяперашніх складаных эканамічных умовах фінансаванне было крайне недастатковым. З бюджэтных сродкаў, прадугледжаных каштарысам, яно выканана толькі на 90 працэнтаў. Па некаторых артыкулах сродкі былі зусім мізэрныя або наогул не выдзяляліся.

Асноўным жа на парадку дня стаяла пытанне аб навукова-даследчай рабоце і падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў у 1996 годзе. З дакладам выступіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін. Ён усебакова прааналізаваў усё станоўчае ў гэтым напрамку дзейнасці, указаў на існуючыя ўпушчэнні і недахопы, на праблемы, якія неабходна вырашаць у бліжэйшы час.

Пасля абмеркавання вынікаў НДР і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у мінулым годзе была прынята адпаведная пастанова, якая прадугледжвае дасягненне ў гэтым напрамку больш значных поспехаў.

У прыватнасці, узяты курс на актывізацыю студэнцкай навукі, павышэнне навуковага патэнцыялу асобных кафедр, пашырэнне прапаганды універсітэцкіх навуковых дасягненняў.

З інфармацыяй аб дзейнасці універсітэта па развіццю замежных сувязей выступіў рэктар Л.А.Шамяткоў. Ён адзначыў, што яны больш актыўна будуць развівацца з краінамі Заходняй Еўропы. Гэта апрабіравана на практыцы і патрабуе меншых фінансавых затрат.

Пасля абмеркавання кандыдатур і тайнага галасавання на конкурснай аснове Савет рэкамендаваў БелВАКу прысвоіць вучоныя званні: прафесараў -- дактарам навук С.Ф.Каморнікаву з кафедры алгебры і геаметрыі, В.Р.Пінчуку з кафедры агульнай фізікі, Ю.С.Ушакову -- загадчыку кафедры радыёфізікі; дацэнтаў -- кандыдатам навук М.М.Дайнэку з кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, У.М.Старчанку з кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры, С.В.Шалупаеву -- дэкану фізічнага факультэта.

На Савеце былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

### АБ'ЯЎЛЕНЫ КОНКУРС

**на лепшую навукова-даследчую работу ў ГДУ імя Ф.Скарыны. Конкурс праводзіцца ў тры этапы: кафедра -- факультэт -- конкурсная камісія. Работы ў конкурсную камісію павінны быць прадстаўлены не пазней 31 сакавіка 1997 г.**

**За даведкамі звяртацца ў службу навукова-тэхнічнай інфармацыі:**

***5-ы корпус, п. 5-14, тэл. 56-73-38.***

## Да вынікаў залікова-экзаменацыйнай сесіі

# ЁСЦЬ НА КАГО РАЎНЯЦЦА

Зімовая залікова-экзаменацыйная сесія на факультэтах і курсах нашага універсітэта праходзіла ў розныя тэрміны. Адны студэнты трымалі выпрабаванне раней, другія -- пазней. Але ўсюды яна ўжо закончылася і ў бліжэйшыя дні будуць падведзены яе агульныя вынікі, аб якіх мы паведамім.

Сёння ж пра ўзровень паспяховасці на геолага-геаграфічным факультэце расказвае намеснік яго дэкана Ю.П.Іваноў:

-- Пачну са спецыяльнасці "Геалогія і разведка карысных выкапняў". Па ёй вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў ужо на трох курсах. Найвышэйшы ўзровень паспяховасці ў гр. РВ-21 -- у сярэднім 4, 3 бала. Усяго на 0,1 ніжэйшы паказчык у гр. РВ-31. А вось першакурснікі прыкметна адсталі. Сярэдні бал іх паспяховасці – 3,7.

Па названай спецыяльнасці самай высокай паспяховасці дасягнулі прафорг факультэта Алена Саўчанка і Наталля Шуманская з гр. РВ-21 і Сяргей Кадол з гр. РВ-31. А вось А.Мянькоў і А.Самарыкаў за акадэмічную непаспяховасць з факультэтам развіталіся.

На спецыяльнасці "Геафізічныя метады пошуку карысных выкапняў" вызначыліся геафізікі-эколагі гр. ГФ-52. Сярэдні бал іх паспяховасці -- 4,4. У геафізікаў-пяцікурснікаў ён роўны 4 балам, а ў чацвёртакурснікаў абедзвюх груп аднолькавы – 3,4. Найбольш высокай паспяховасці на экзаменах па гэтай спецыяльнасці дабіліся Віталій Лукша з гр. ГФ-42 і Аліна Сянкевіч з гр. ГФ-52. Сярод тых, хто атрымаў нездавальняючыя адзнакі, -- В.Гулевіч і А.Мустафін.

Сярод будучых гідрагеолагаў і інжынераў-геолагаў выдатныя адзнакі на прайшоўшай сесіі атрымалі чацвёртакурснікі Марыя Сокава, Марына Анацьева, Уладзімір Грыбайла, Юрый Доўгалапцеў, староста групы Ігар Коўгар, пяцікурснікі Святлана Аруцюнянц, Ганна Жогла і Аляксандр Серак. І вельмі слабыя веды паказалі А.Казловіч і М.Бабок.

У географаў-педагогаў выдатнымі ведамі вызначыліся Аляксей Ляўцоў, Алег Курашоў, Ганна Лабанава, Алена Пінчук, Міхаіл Наўроцкі, Ганна Лясковіч, Аляксандр Цыганоў. Дарэчы, сярэдні бал паспяховасці ў гр. ГП-І -- 4 балы. На 0,3 бала ніжэйшы паказчык у географаў-першакурснікаў, якія рыхтуюцца да навуковай дзейнасці. У географаў толькі выдатныя адзнакі на экзаменах атрымалі першакурснікі Марына Жукава, Наталля Кавалькова, Мікалай Верамееў, другакурснікі Віталь Баброў, Наталля Басак, Вольга Жураўлёва, Наталля Кейзерава, Іна Міхалка.

# НА КАНІКУЛАХ НЕ СУМАВАЛІ

Хутка бягуць дні ў вучэбных семестрах, а яшчэ шпарчэй-- студэнцкія канікулы. Здаецца, толькі нядаўна былі хваляванні ў час зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі, штудзіраванне канспектаў і падручнікаў, каб атрымаць у залікоўках жаданыя станоўчыя адзнакі, якія гарантуюць атрыманне стыпендыі, а ўжо зноў -- за вучобу.

З якім настроем прыйшлі пасля адпачынку ў аўдыторыі студэнты? Не сакрэт, што далейшая вучоба будзе залежыць у многім ад таго, як яны змаглі правесці свае канікулы пасля нялёгкіх выпрабаванняў сесіі. Многія, зразумела, набіраліся сіл дома, акружаныя клопатам і ўвагай бацькоў. Іншыя ж аддалі перавагу адпачынку і лячэнню па пуцёўках прафсаюза, якімі іх змог, па меры сённяшніх магчымасцей, забяспечыць прафком студэнтаў нашага універсітэта. У ліку гэтых іншых аказаліся ў асноўным першакурснікі, якім не споўнілася 18 гадоў. Пуцёўкі ім выдзяляліся бясплатна з Чарнобыльскага фонду. Са сродкаў жа сацстраху іх было толькі 5 -- у мясцовую здраўніцу "Чонкі" і санаторый-прафілакторый Беларускай чыгункі.

Рэспубліканскія санаторыі "Буг", "Пралеска", "Сасновы бор", "Бярэсце", імя Леніна (г.Бабруйск) прынялі на лячэнне і аздараўленне звыш 50 студэнтаў ГДУ. І яны пастараліся правесці свой зімовы адпачынак з найбольшай карысцю.

Як бачна, рэаліі сённяшняга нялёгкага становішча ў эканоміцы краіны адмоўна адбіваюцца і на сферы абароны нашых сацыяльных інтарэсаў.

Т.ДУБЯК.

# ХРОНІКА

У студзені гэтага года ва універсітэце адбыліся некаторыя кадравыя змяненні.

Па ўласнай просьбе ад абавязкаў прарэктара па навуковай рабоце вызвалены доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН Беларусі **Сердзюкоў** Анатоль Мікалаевіч. Ён працягвае працу ва універсітэце прафесарам кафедры тэарэтычнай фізікі.

Прарэктарам па навуковай рабоце загадам па універсітэту назначаны доктар тэхнічных навук, прафесар **Лін** Дзмітрый Рыгоравіч. Адначасова па ўласнай просьбе ён вызвалены ад абавязкаў загадчыка кафедры агульнай фізікі.

Па ўласнай просьбе ад абавязкаў дэкана фізічнага факультэта вызвалены **Семчанка** Ігар Валянцінавіч. Ён узначаліў кафедру агульнай фізікі.

Дэканам фізічнага факультэта назначаны **Шалупаеў** Сяргей Вікенцьевіч, які раней быў дацэнтам кафедры агульнай фізікі.

Начальнікам навукова-даследчага сектара назначаны асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі **Сафонаў** Васіль Рыгоравіч, які ў бягучым навучальным годзе паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

***

У склад кафедры оптыкі увайшла былая кафедра фізічнай метралогіі.



# ГРАМАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ НАВУКОВАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

У канцы снежня 1995 г. у Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Беларускага прафесарскага сходу. 3-га чэрвеня 1996 г. Міністэрства юстыцыі зарэгістравала Статут гэтай новай грамадскай арганізацыі навуковай інтэлігенцыі.

У адпаведнасці са Статутам БПС "з'яўляецца незалежнай грамадскай арганізацыяй, якая аб"ядноўвае на добраахвотных пачатках работнікаў адукацыі, навукі, культуры, іншых спецыялістаў, чыя дзейнасць звязана з педагагічнай або навуковай работай", і якія маюць вучоныя званні і ступені прафесара або доктара навук.

Сярод асноўных мэт і задач БПС -- садзейнічаць развіццю адукацыі, навукі і культуры ў Рэспубліцы Беларусь, абарона сацыяльных інтарэсаў і правоў работнікаў адукацыі і навукі і сваіх членаў у дзяржаўных органах, дабівацца ўдзелу ў распрацоўцы заканадаўчых асноў і праграм у галіне адукацыі і навукі, аналізаваць эканамічны стан сваёй галіны і даваць ацэнку наяўнай сітуацыі, інфармаваць міжнародныя супольніцтвы аб стане сістэмы адукацыі і навукі ў нашай рэспубліцы і інш.

БПС будзе ажыццяўляць выдавецкую дзейнасць і ствараць свае гаспразліковыя структуры, вылучаць і падтрымліваць са сваіх членаў кандыдатаў для ўдзелу ў выбарчых кампаніях, узаемадзейнічаць з роднаснымі міжнароднымі арганізацыямі.

У студзені г.г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту адбыўся ўстаноўчы прафесарскі сход Гомельскага аддзялення БПС. На ім адзначалася, што ў ВНУ і НДІ нашага горада працуе звыш 100 прафесараў і доктараў навук. Гэта значны творчы патэнцыял. Ім ствараюцца такія матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, якія ў відавочнай ступені вызначаюць навукова-тэхнічны, тэхналагічны і духоўны прагрэс. Аб гэтым сведчыла і наладжаная выстаўка шматлікіх навуковых прац вучоных нашага горада. Аднак, як сведчаць факты, у выніку сацыяльна-палітычнай сітуацыі, якая склалася за апошнія гады, гэты патэнцыял размежаваны, падзелены на часткі па сваіх арганізацыях. Яго аб'яднанне ў адно цэлае дазволіць на больш высокім узроўні вырашаць ключавыя задачы развіцця адукацыі і навукі, абараняць свае інтарэсы.

Усе выступіўшыя на ўстаноўчым сходзе вучоныя, у тым ліку і загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін нашага універсітэта прафесар В.В.Валетаў, гаварылі аб цяжкім матэрыяльным становішчы навуковых устаноў і ВНУ, вучоных і навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў, далі ў асноўным крытычны аналіз праекта Канцэпцыі развіцця навукі ў Рэспубліцы Беларусь, які быў апублікаваны ў газеце "Рэспубліка" за 10 студзеня г.г.

На ўстаноўчым сходзе Гомельскага аддзялення БПС, у якім прыняў удзел і выступіў намеснік старшыні аблвыканкома А.М. Ярчак, выбраны пастаянна дзейнічаючы прэзідыум навукоўцаў. У яго ўвайшлі найбольш аўтарытэтныя прафесары, доктары навук г.Гомеля: А.І.Кіеня /медінстытут/, А.М.Кажэўнікаў /ІЛ АНБ/, М.В.Максіменка /ГДУ імя Ф. Скарыны/, Л.С.Пінчук /ІММПС/, А.В.Рагачоў /БелДУТ/, А.М.Шаблоўскі /ГПІ/ і С.В. Шчарбакоў /БелДУТ/.

На арганізацыйным пасяджэнні прэзідыума яго старшынёй абраны С.В.Шчарбакоў, намеснікамі -- М.В.Максіменка і Л.С.Пінчук.

Прэзідыум Гомельскага аддзялення БПС запрашае да супрацоўніцтва ўсіх вучоных ВНУ, НДІ і прамысловасці Гомельшчыны. За даведкамі па ўсіх пытаннях звяртацца па тэлефоне 52-53-64.

# ПРЫМЦЕ ЎДЗЕЛ У КАНФЕРЭНЦЫІ

14-16 мая 1997 года ў г.Мінску пройдзе III Рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў Беларусі /НДРС - 97/.

Аргкамітэт запрашае студэнтаў дзяржаўных і недзяржаўных ВНУ Рэспублікі Беларусь і лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу 1996 года на лепшую навуковую работу студэнтаў па гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навуках прыняць удзел у яе рабоце.

Рабочая мова канферэнцыі -- руская і беларуская. Да пачатку яе работы будзе выдадзены зборнік тэзісаў. Лепшыя, на думку журы, даклады будуць апублікаваны ў поўным аб'ёме пасля канферэнцыі ў зборніку навуковых работ. Формы ўдзелу ў рабоце канферэнцыі:

-- выступленне з пленарным дакладам;

-- выступленне з секцыйным дакладам;

-- удзел у канферэнцыі /без даклада/.

Інфармацыю па афармленню тэзісаў дакладаў і навуковых напрамках работы канферэнцыі можна атрымаць у цэнтральным савеце па НДРС /гал.корп. п. 2-28/ ці ў адказных за НДРС на факультэтах /дэканаты/.

А.ГАЕЎ.

# АЛІМПІЯДЫ ВЫЯЎЛЯЮЦЬ ТАЛЕНТЫ



**У** 1985 г. каманда матэматычнага факультэта ГДУ была ўпершыню запрошана на рэспубліканскую алімпіяду па праграміраванню, якая праходзіла ў г.Мінску на базе БДУ. У сувязі з гэтым на матфаку правялі факультэцкую алімпіяду па праграміраванню. З таго часу практычна штогод у нас праводзяцца такія алімпіяды. Спачатку яны былі агульнауніверсітэцкімі (запрашаліся каманды фізічнага і эканамічнага факультэтаў), а на працягу ўжо 2 гадоў наша алімпіяда з'яўляецца агульнагарадской: да ўдзелу ў ёй запрашаюцца студэнты ВНУ, лепшыя школьнікі г.Гомеля -- з гарадскога ліцэя N1, СШ N56, ВВК пры матфаку ГДУ, а нядаўна падключыліся таксама вучні зноў утворанага абласнога ліцэя і СШ N27. Ужо 2 гады праводзіцца сеткавы тур, калі ўдзельнікі могуць знаходзіцца па месцу сваёй пастаяннай вучобы, атрымліваючы ў дзень турніру заданні шляхам мадэмаў і тэлефонных відаў сувязі, і вяртаючы праз 5 гадзін такім жа чынам свае рашэнні ў журы. На алімпіядзе праводзіцца камандны тур у адпаведнасці з умовамі каманднага студэнцкага першынства свету па прагра-міраванню (у якасці заданняў прапаноўваюцца арыгінальныя задачы з фіналаў гэтага турніру -- на англійскай мове).

Правілы правядзення такіх спаборніцтваў наступныя: у кожную каманду ўваходзяць 3 студэнты (толькі адзін з іх можа быць пяцікурснікам); кожнай камандзе выдзяляецца адзін камп"ютэр на ўвесь час правядзення спаборніцтваў (5-6 гадзін); мэта -- рашыць за адведзены час як мага большую колькасць задач з прапанаваных (звычайна 5-8); у выпадку, калі некалькі каманд рашылі аднолькавую колькасць задач, улічваецца сумарны час іх рашэння, які налічваецца наступным чынам: час рашэння задачы -- гэта абсалютны час ад пачатку спаборніцтваў да прыёму задачы журы плюс штрафны час задачы; задача прымаецца журы толькі ў тым выпадку, калі праграма прайшла ўсе тэсты, ім прапанаваныя (іх бывае да 40 і больш); па 2 пераможцы рэгіянальных турніраў (21 з ўсёй планеты) запрашаюцца на фінальны тур у ЗША.

Трэба адзначыць, што работа па падрыхтоўцы і правядзенню алімпіяд прынесла пэўныя поспехі. У 1993 г. рэспубліканская алімпіяда па інфарматыцы і праграміраванню праводзілася ў г.Гродна і наша каманда заняла на ёй першае месца. З мінулага года рэспубліканская алімпіяда перамясцілася ў Мінск (БДУ). І зноў каманда нашага універсітэта выступае пасляхова, уступаючы першынство толькі гаспадарам турніру. У снежні мінулага года дзве каманды ГДУ: першая (К.Вулах, А.Галацін і В.Краўцоў) і другая (І.Ермалаеў, А.Фокін, І.Ганчарэнка) па выніках адборачнай гарадской алімпіяды ўпершыню прымалі ўдзел у рэгіянальным турніры каманднага студэнцкага першынства свету па праграміраванню. Адначасова ў Санкт-Пецярбургу і Барнауле спаборнічала больш 70 каманд ВНУ Расіі, Беларусі, Эстоніі, Кіргізіі, Арменіі, Казахстана. Нашы каманды стартавалі вельмі добра. За гадзіну да канца спаборніцтваў яны знаходзіліся ў двадцатцы лідэраў, вышэй нашага флагмана -- БДУ. Але, на жаль, вопыту такіх спаборніцтваў нашым камандам не хапіла, і яны так і не змаглі стаць прызёрамі.

Хочацца шчыра падзякаваць за аказаную маральную і матэрыяльную падтрымку нашым камандам першаму прарэктару прафесару М.В.Селькіну, дэкану матэматычнага факультэта дацэнту У.В.Арлову, старшыні прафкома студэнтаў Н.І.Колтышавай, галоўнаму бухгалтару І.А.Куравай, а таксама кіраўніку Гомельскага аддзялення Фонда Сораса Ю.І.Варонежцаву, сумеснымі намаганнямі якіх змагла адбыцца паездка ў Санкт-Пецярбург нашых студэнтаў.

**Ч**аму мы лічым вельмі важным рэгулярнае і якаснае правядзенне нашай цяпер ужо гарадской студэнцкай алімпіяды? Па-першае, алімпіяда -- гэта канцэнтраваная мадэль жыцця, калі ўсё, што можа спатрэбіцца потым у прафесіянальным і практычным праграміраванні, запатрабуецца ў надзвычай эмацыянальнай форме непасрэдна на алімпіядзе.

Наш рэгулярны ўдзел у рэспубліканскіх студэнцкіх алімпіядах выявіў і недахопы як у арганізацыі парадку вывучэння камп'ютэрных дысцыплін, так і ў іх змесце. Напрыклад, было перанесена вывучэнне машынна-арыентаваных моў тыпу "асемблер" на малодшыя курсы з той мэтай, каб больш фундаментальна і глыбока студэнты разумелі ўсе наступныя камп'ютэрныя дысцыпліны. Акрамя таго, было відавочна, што паступаючыя да нас школьнікі прыкметна больш слабейшыя па ўзроўню за сваіх мінскіх калег. Менавіта на гэтых напрамках мы сканцэнтравалі свае намаганні і зараз можам упэўнена сказаць, што ў многім мы ўжо падраўняліся з вядучай ВНУ рэспублікі -- БДУ. Цяперашні ўдзел у рэгіянальным туры каманднага студэнцкага першынства свету па праграміраванню таксама ўказаў нам на недахопы -- перш за ўсё матэматычнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў, а таксама ўменні эфектыўна прымяняць матэматычныя веды для рашэння прыкладных задач. Акрамя таго, асобнай адпрацоўкі патрабуюць навыкі калектыўнай работы, асабліва ва ўмовах абмежаванасці часу, адведзенага на яе. Трэба падкрэсліць, што ўсе недахопы, выяўленыя раней і зараз, павінны быць ухілены ў самім вучэбным працэсе для павышэння ў цэлым якасці адукацыі, якая прапаноўваецца на нашым факультэце.

Такія пастаянныя клопаты аб павышэнні якасці адукацыі акупаюцца тым, што практычна ўсе нашы выпускнікі спецыяльнасці "Праграмнае забяспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм" лёгка знаходзяць сабе работу як у Беларусі, так і за яе межамі, нягледзячы на агульнае цяжкае становішча на рынку працы.

Яшчэ адной з мэт алімпіяды з'яўляецца прыцягненне ўвагі лепшых школьнікаў менавіта да матэматычнага факультэта ГДУ як да найбольш эфектыўнага сродку падрыхтоўкі сябе да прафесіянальнага праграміравання.

**М.ДАЛІНСКІ,**
**ст.выкладчык кафедры матэматычных праблем кіравання**

**(Працяг будзе).**



ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

# АБМЕРКАВАНА НА ПРАФКОМЕ

Наш універсітэт павінен быць не толькі флагманам адукацыі і навукі ў сваім рэгіёне, але і цэнтрам высокай культуры, узорнай санітарыі. Што тычыцца апошняга, то трэба прызнаць, што ў гэтай справе мы шмат недапрацоўваем. Таму не выпадкова на разгляд чарговага пасяджэння прафкома было вынесена пытанне аб рабоце АГЧ у вучэбным корпусе N5.

З інфармацыяй выступіла камендант названага вучэбнага корпуса М.В.Малкова. Яна паведаміла аб той рабоце, якая праводзіцца для забеспячэння неабходных умоў для правядзення вучэбнага працэсу. Разам з тым прызнала і маючыя месца недахопы. Пасля заняткаў у асобных аўдыторыях і на паверхах застаецца шмат смецця. Не ўсе прыбіральшчыцы добрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаў.

На час праверкі на першым і другім паверхах былі закрыты туалеты. У вучэбным корпусе няма вентыляцыі. У аўдыторыях 2-26 і 4-17 дрэннае асвятленне.

Пры абмеркаванні пытання аб рабоце АГЧ у вучэбным корпусе N5 старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі, старшыня пастаяннай камісіі прафкома па ахове працы і тэхнікі бяспекі У.С.Стрыжнёў, член прафкома І.М.Елісеева разам з крытычнымі заўвагамі адзначылі станоўчую работу каменданта Н.В.Малковай, прыбіральшчыц В.А.Драбышэўскай, С.Я.Селязнёвай, Г.В.Непша, Г.І.Машкоўскай, А.А.Кісялёвай.

У сваім рашэнні прафком прадугледзеў меры па ўхіленню недахопаў, якія выяўлены ў вучэбным корпусе N5.

Пытаеце -- адказваем

# ЯК ВЫДЗЯЛЯЮЦЦА ПУЦЁЎКІ

Студэнцкі бюджэт вядома ж небагаты. Без бацькоўскай матэрыяльнай дапамогі на яго не пражывеш. А калі да таго ж студэнт з няпоўнай, шматдзетнай сям"і ці горш таго, наогул сірата, пражыць яму ў наш час яшчэ больш складана. Таму не здзіўляе той факт, што пуцёўкі ва універсітэцкі санаторый-прафілакторый у студэнцкай моладзі карыстаюцца павышаным попытам. Тут за адносна невялікую плату можна харчавацца тры разы ў дзень на працягу трох тыдняў, ды яшчэ неабходнае лячэнне атрымліваць.

Аднак не ўсе ведаюць, што карыстацца паслугамі універсітэцкай здраўніцы студэнт можа толькі адзін раз на год. Двойчы пабываць там маюць права студэнты, якія стаяць на дыспансерным уліку, і сіроты. Пуцёўкі выдзяляюцца праз прафсаюзныя бюро факультэтаў.

**ГРАФІК ЗАЕЗДАЎ У САНАТОРЫЙ-ПРАФІЛАКТОРЫЙ ГДУ**
**на люты-чэрвень 1997 года**

З 17.02. па 9.03.; з 21.04. -- 11.05;
з І 0.03 -- 30.03; з 12.05. -- 1.06;
з 31.03 -- 20.04; з 2.06. -- 22.06.

Заезд з 17 лютага праводзіцца за кошт сродкаў Чарнобыльскага фонду, пуцёўкі выдаюцца студэнтам да 18 гадоў бясплатна.

*Захоўваць парадак і дысцыпліну*



# ВЫСЕЛЕНЫ З ІНТЭРНАТАЎ

Здаўна студэнцкі інтэрнат называюць родным домам. Але ні для каго ён не з"яўляецца прыватным будынкам. Тут кожны павінен строга захоўваць правілы ўнутранага распарадку. На жаль, іх прытрымліваюцца далёка не ўсе. Гэта адносілася і да студэнтаў фізічнага факультэта М.Цвірко з гр. Ф-34 і С.Мудрэўскага з гр.Ф-32, якія жылі ў пакоі 326 інтэрната N1. Юнакі дазвалялі сабе распіццё спіртных напіткаў у інтэрнаце, што не магло застацца не заўважаным. У выніку яны абодва выселены са студэнцкага дома і павінны былі шукаць прыватнае жыллё.

Не вызначаліся дысцыплінаванасцю першакурсніцы В.Кобец з геолага-геаграфічнага факультэта (гр. ГН-11) і Т.Чыжык з гісторыка-юрыдычнага факультэта (гр. П-13), якія жылі ў пакоі 10-05, а таксама другакурсніца Ж.Краўчанка (гр. Б-23), якая займала месца ў пакоі 10-09. Гэтыя дзяўчаты вельмі вальготна паводзілі сябе ў інтэрнаце N4. За сістэматычнае парушэнне правілаў унутранага распарадку яны таксама выселены з інтэрната.

**В.ГАПЕЕЎ,**
**начальнік аддзела выхаваўчай работы.**



# ТЭМАТЫЧНЫЯ ВЕЧАРЫ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ ГДУ Ў ІІ СЕМЕСТРЫ 1996-97 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

**У лютым:** 15-га -- вечар, прысвечаны І.Мележу; 16 -- вечар адпачынку; 21 -- "Агеньчык", прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны.

**У сакавіку**: 1-га -- турнір "За цудоўных дам"; 2 -- "Провады зімы"; 6 -- святочны канцэрт, прысвечаны Дню 8 Сакавіка; 8 -- "Агеньчык"; 9 -- вечар аўтарскай песні; 13 -- "Містэр Універсітэт"; 22-23 -- Дні матэматычнага факультэта; 27 -- Дзень тэатра; 29-30 -- Дні філалагічнага факультэта.

**У красавіку:** 1-га -- "Гумарына"; 5-6 -- Дні фізікаў; 17 -- 5-ы фестываль маладзёжнай песні; 19-20 -- Дні гісторыка-юрыдычнага факультэта; 29 -- канцэрт, прысвечаны Дню працы.

**У маі:** 3-4-га -- вечар сяброў; 7 -- "Агеньчык" ветэранаў; 15 -- сольны канцэрт "Дзянніцы"; 24-25 -- вечары аўтарскай песні; 27 -- заключны канцэрт, 31 -- "Агеньчык", прысвечаны Дню абароны дзяцей.

**У чэрвені:** 7-8-га -- вечары сяброў; 14, 15, 21, 22, -- выпускныя балі.

Усе мерапрыемствы -- платныя.

**Культурны цэнтр ГДУ**

АБ ПАЭЗІІ НАШАЙ ВЫПУСКНІЦЫ



У паэзіі прасочваецца заканамернасць: найлепшыя вершы атрымліваюцца тады, калі паэт апявае ў іх свой родны край з усімі праблемамі, асаблівасцямі, яго выдатнымі з'явамі і справамі, калі паэт прысвячае іх таму, з чаго вырас, з чым нарадзіўся, што найглыбей запала яму ў свядомасць. Да такіх паэтаў належыць і Таіса Мельчанка, наша зямлячка.

Любоў да Радзімы, занепакоенасць яе праблемамі, радасць за яе выдатнасці і шчасце, паэтычная праца з максімальнай карысцю для Радзімы ў поўным сэнсе акрыляюць гэту паэтэсу.

Яна нарадзілася на Гомельшчыне. Скончыла гісторыка-філалагічны факультэт нашага універсітэта. Працуе настаўніцай роднай мовы і літаратуры ў СШ N 53. Член Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь. Таіса Мельчанка друкавалася ў калектыўных зборніках паэзіі "Гары, агонь Кастрычніка!", "Мы — беларусы", "Каласы роднай мовы", "Матчына слова". Яна аўтар паэтычных кніг "Вясковая песня" (1984 г.), "Бацькоўскі дом" (1989г.), "Званок у верасень" (1993 г.).

У новай кнізе паэтэсы "Каласы болю" яе творчасць прадстаўлена больш поўна. Гэта зборнік лірычных вершаў, які складаецца з чатырох раздзелаў.

Першы раздзел зборніка "Бязбожнікі" раскрывае вытокі бездухоўнасці нашага грамадства, уздымае пытанне аб прызначэнні чалавека на зямлі, дзеліць з ім боль і трывогу за будучыню нашчадкаў.

*З нас вынішчалі Бога —*
*Вунь крыж са званіцы ляціць.*
*Ад спадчыннага, ад дарагога,*
*Стараліся ўсіх адлучыць.*
("Нельга ў душы без Бога").

Самі назвы вершаў гэтай часткі гавораць пра іх змест: "Нельга ў душы без Бога", "Прарочы сон», "Прысуд", "Абраза", "Ерэтычка", "Матчына споведзь", "Кіпцюры недаверу" і іншыя.

Цікавым з'яўляецца верш "Матчына споведзь", які прысвечаны маці, што страціла сына на афганскай вайне. Жанчына не верыць, што яе "смелы сынок" "пасяліўся ў цёмнай цынкавай дамоўцы", ёй шкада, «што не ўрэзалі зверху аконца, каб глянуў у вочы апошні разок». Маці спадзяецца «мо, прыйдзе, мо вярнецца», але ёй застаўся толькі ордэн, які «як крыжык, цалуе».

Другі раздзел «Зерне Скарыны» адлюстроўвае сучасную барацьбу думак, ідэй і прынцыпаў у нялёгкі час Адраджэння. Ён цалкам прасякнуты неспакоем за лёс роднай

# НА КРЫЛАХ РАДЗІМЫ

беларускай мовы. Аўтар імкнецца абудзіць нацыянальную самасвядомасць грамадзян, гонар і павагу да матчынага слова. Таіса Мельчанка імкнецца данесці свае пачуцці і павагу да роднай мовы чытачу, хвалюецца за яе лёс.

*Нашу мову-матулю*
*няверцы прызнаці не хочуць.*
*І яна, як жабрачка,*
*з працягнутай ходзіць рукой.*
*Кожны злыдзень у твар ёй*
*і кпіць, і нахабна рагоча,*
*— Прэч з дарогі, мужычка!*
*Ля хаты з тарбінай не стой!*
("Сябрына").

*Цудоўных моў на свеце ёсць*
*нямала,*
*А для мяне — раднейшая адна.*
*Яе зямля-бабуля спавявала,*
*Крыніц гучанне звонкае дала.*
("Раднейшая").

Трэці раздзел "Спадчына" расказвае пра непарыўную сувязь чалавека з Радзімай, яго любоў і пашану да яе, аўтар бярэ на сябе частку чарнобыльскага болю, заклікае суайчыннікаў зберагчы самае дарагое — спадчыну. Гэтыя тэмы аўтар раскрывае ў вершах: "Марафон пакуты", "Дрэва славянства", "Слова зямлі да эмігрантаў" і інш.

*Наша дрэва славянства*
*чарнобыльскім дротам абвіта.*
*І атрута-гадзюка паўзе да яе*
*каранёў.*
*Зорка лёсаў людскіх ледзьве-*
*ледзь не сарвецца з арбіты —*
*Перапоўнена болем да самых,*
*да самых краёў.*
("Дрэва славянства").

Апошні раздзел зборніка «Кліч лёсу» паказвае духоўны і ўнутраны свет лірычных герояў, іх узаемаадносіны, пачуцці і імкненні. У ім значнае месца займае любоўная тэматыка, каханне: "Замова", "Прызнанне", "Сухастой", "Фальшывыя ноты", "Чаканне", "Апошні званок", "Бывай", "Родны голас", "Сцяжынка вернасці", "Мёд любові". Асноўнай думкай усіх вышэйпералічаных вершаў можна лічыць наступныя радкі:

*...каханне святое --*
*адно на дваіх.*
*Трэці лішні —*
*спакуса і здрада.*
("Замова").

Цікавым у зборніку з'яўляецца вобраз аўтара. У вершы "Абраза" на гэтым вобразе паказана праблема паэта і паэзіі ў сучасны перыяд.

*Адна спадарыня суседка*
*Снуе за мною, нібы цень.*
*Пытае: «Як жывеш, паэтка?*
*Ці ўзрос на словы працадзень?*
*Гарбацішся, як катаржанка.*
*Каму патрэбен гэты верш?*
*У Музы будзеш век служанка*
*І галадранкаю памрэш!»*
*Гляджу я на яе выразна —*
*Сілком жа з хаты не папрэш.*
*Пяро змагаецца з абразай.*
*У муках нараджае верш!*

Паэтка сцвярджае, што яе прафесія не горшая за іншую, яна не атрымлівае шмат грошай, як суседка, што «не канчала інстытутаў, а столькі ад жыцця ўзяла», але гэта справа ёй па сэрцы, з дапамогай паэзіі жанчына "змагаецца з абразай".

Вершы ў зборніку ў асноўным напісаны ад першай асобы, таму часцей сама аўтарка з'яўляецца іх лірычным героем:"Я думала: дзівосны свет які", "Я кінула выклік суровы", "Я ведаю: парыўна расхіне...", "Я пытанне стаўлю на рабро", "Я не твая", "Я з богам цябе адпусціла" і іншыя.

Дадзены зборнік канчаткова замацаваў за Т.Мельчанка годнасць таленавітага, самабытнага і глыбока нацыянальнага паэта.

**Т.БАТУРАВА,**
**студэнтка гр. Б-32**
**філалагічнага факультэта.**



*Тэатральная прэм'ера*

# ГЭТЫЯ СМЕШНЫЯ АЎЦЮКОЎЦЫ...

Студэнцкі тэатр-студыя "Если бы...", якім кіруе рэжысёр Генадзь Варонін, паказаў сваю новую работу -- спектакль "Аўцюкоўцы". Гэта інсцэніроўка па матывах некаторых вядомых анекдотаў пра жыхароў вёсак Малыя і Вялікія Аўцюкі Калінкавіцкага раёна, якія сабраны ў аднайменнай кнізе беларускім пісьменнікам Ул.Ліпскім.

Дынамічнае, насычанае жартамі, гумарам дзейства, убачылі студэнты на сцэне актавай залы. Ім было вельмі цяжка ўстрымацца ад смеху, гледзячы на дасціпнасць, кемлівасць герояў-вяскоўцаў, якія знаходзяць неардынарнае выйсце з любой жыццёвай сітуацыі. Таленавітым і шчырым, добрым і даверлівым, з зайздросным пачуццём гумару паўстаў у спектаклі са сцэны жыхар-аўцюковец.

Пастаноўка мела вялікі поспех у гледача, дзякуючы не толькі сваёй тэматыцы, але і выдатнай гульні студэнтаў-акцёраў: Н.Серыкавай, С.Карчэўскай, В.Навуменкі, М.Сізовай, Г.Гуляевай, А.Пацкова і інш.

Чаму гэты творчы калектыў абраў для пастаноўкі такі даволі незвычайны жанр? Адказ просты: асноўны тэматычны напрамак тэатра-студыі -- гумарыстычны. А яшчэ "аўцюкоўская" тэма стала блізкай тэатру таму, што яму як адзінаму прадстаўніку творчых студэнцкіх калектываў Гомельшчыны пашчасціла прымаць удзел са сваімі мініяцюрамі ў І Усебеларускім фестывалі сатыры і гумару, які праходзіў два гады таму назад у вёсках Малыя і Вялікія Аўцюкі і на якім стаў дыпламантам. Так што гумарыстычную аўцюкоўскую атмасферу ўдзельнікі тэатра на сабе добра зведалі.

Сваю новую работу універсітэцкі тэатр-студыя плануе паказаць і на іншых сцэнічных пляцоўках горада.

**Т.ДУБЯК.**

# "ВУЛІЦА, ПОЛЕ, ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ..."

Незвычайная асоба, выдатны артыст і спявак, ён здольны сваім талентам, яркай індывідуальнасцю, дасціпнасцю і гумарам захапіць і ўсхваляваць слухачоў, прымусіць іх плакаць і смяяцца разам з ім. Гэта чалавек, у сэрцы якога нясцерпным болем адгукаюцца падзеі нашага сённяшняга жыцця, якога да глыбіні душы хвалюе і непакоіць будучыня Беларусі, лёс матчынай мовы і культуры. Ён жыве надзеяй на адраджэнне былой велічы роднай старонкі, на ўсведамленне беларусамі сваёй адметнасці, нацыянальнай самабытнасці і намагаецца сваёй творчасцю паспрыяць паскарэнню гэтых працэсаў. Усе пачуцці і настроі спевака, яго жыццёвыя прынцыпы, спадзяванні і надзеі, дзякуючы вялікаму таленту, знаходзяць адлюстраванне ў ягоных песнях.

Гэты чалавек -- знакаміты беларускі бард з Гародні Віктар Шалкевіч, творы якога добра вядомыя не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і за яе межамі. Ягоная зорка ззяла на небасхіле нацыянальнай бардаўскай песні ў пачатку 90-х гадоў, калі ён упершыню стаў пераможцам беларускага хіт-параду радыё "Свабода". І з гэтага часу пачаўся ўзыход Віктара Шалкевіча на музычны Алімп; нават сёння вялікай папулярнасцю карыстаецца яго першы альбом пад назвай "Правінцыя", у які ўвайшлі лепшыя творы спевака пачатку 90-х. Канцэрты гэтага барда ўжо даўно праходзяць не толькі ў Гародні, але і ў Мінску, Оршы, Кіеве, Беластоку.

І вось нядаўна выступленне Віктара Шалкевіча з поспехам прайшло ў Гомельскім Доме настаўніка, на якім прысутнічалі студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта нашага універсітэта. Знакаміты бард наведаў Гомель пад час свайго турнэ па Беларусі з мэтай пазнаёміць слухачоў з новым альбомам, што называецца "Смутны беларускі блюз".

Песні В.Шалкевіча вельмі розныя не толькі па гукавым афармленні і аранжыроўцы, але і па змесце: вясёлыя і сумныя, жартоўныя і сур"ёзныя, простыя і складаныя -- як, урэшце, і сама супярэчлівая натура аўтара. Бо гэта чалавек, які валодае не толькі выдатнымі музычнымі здольнасцямі, але і талентам пераўвасаблення, як магніт, прыцягваючы ўвагу слухачоў да сваёй асобы.

Нягледзячы на сваю знешнюю прастату, ягоныя творы неяк непрыкметна і прыхавана, але і вельмі настойліва ўздымаюць праблемы, што хвалююць самога творцу. Так, традыцыйнай для барда стала тэма малой радзімы, правінцыі. Шалкевіч з незвычайнай пяшчотай і любоўю гаворыць пра яе, сцвярджае яе права на жыццё, на самастойнае вырашэнне вечных пытанняў і дылем.

Пачуўшы хаця б некалькі ягоных песень, няцяжка зразумець, што як творца і як чалавек бачыць свой ідэал Віктар Шалкевіч не ў сучаснай Беларусі, а недзе там, у далёкай гісторыі, у сярэднявеччы. У пошуках крыніц натхнення спявак вяртаецца ў глыбіню стагоддзяў, у той час, калі правіць беларуска-літоўскай дзяржавай Вітаўт Вялікі, калі выдаюцца на беларускай мове кнігі Скарыны, Цяпінскага, Буднага, калі пад бела-чырвона-белымі штандартамі выходзяць на бітву з ворагамі беларускія харугвы. Іменна там, у Вялікім княстве Літоўскім, бачыць Шалкевіч сваю Радзіму, менавіта аб такой велічы марыць ён для роднай Беларусі. Нехта, мабыць, скажа: дзівак... Што шукае ён у руінах былой велічы і славы? Адказы на гэтыя пытанні дае спявак у сваіх творах: беларускі народ лічыць ён нашчадкам і пераемнікам сапраўды "вялікіх традыцый, вялікай гісторыі" беларуска-літоўскай дзяржавы.

Можа, таму Віктар Шалкевіч так рэзка выступае супраць касмапалітызму, манкурцтва і нацыянальнага нігілізму.

Ягоныя творы будзяць нас ад доўгага сну, прымушаюць думаць, разважаць, ставяць перад намі найважнейшыя пытанні: хто мы? адкуль мы? І, напэўна, у гэтым і ёсць заслуга перад народам Віктара Шалкевіча, чалавека і творцы, які адарваны ад сучаснасці і шукае карані нашае Памяці, Годнасці і Свядомасці недзе там, у Вялікім княстве Літоўскім:

*Сонца зранку раскідае*
*скупыя прамені*
*Па зямлі, дзе прыходзіцца*
*жыць.*
*Вуліца, поле, Вялікае*
*княства,*
*Жаўрукі ў аблоках звіняць...*
*Вольнаму -- воля --*
*найвялікшае шчасце!*
*Нават вецер не дагоніць каня.*

**Святлана КАГАН,**
**студэнтка гр. БА-13**
**філалагічнага факультэта.**

*спорт спорт спорт*

## НЕ СТРАЦІЎ МАЙСТЭРСТВА БЫЛЫ ЧЭМПІЁН

У Мінску прайшлі спаборніцтвы па фехтаванню на Кубак Беларусі. За ганаровы трафей змагаліся ветэраны. У іх турніры перамогу аспрэчвалі заслужаны майстар спорту, тры майстры спорту міжнароднага класа і каля 20 майстроў спорту.

Сярод шпажыстаў вызначыўся старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання нашага універсітэта, заслужаны трэнер Беларусі, экс-чэмпіён Савецкага Саюза В.В.Лісоўскі. Ён узняўся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару. У гэтым жа відзе зброі трэцім прызёрам спаборніцтваў стала выхаванка факультэта фізічнай культуры майстар спорту міжнароднага класа па сучаснаму пяцібор'ю, чэмпіёнка свету Жана Шубянок.

## УЗНАЧАЛІЛА ДЗЕСЯТКУ МАЦНЕЙШЫХ

Даўно стала традыцыяй па ацэнках трэнераў, спецыялістаў і аматараў спорту вызначаць дзесятку мацнейшых спартсменаў адышоўшага года. Спіс мацнейшых на Гомельшчыне за 1996 год з вялікім адрывам па набраных ачках узначальвае студэнтка факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта сярэбраны прызёр па сямібор'ю на Алімпійскіх гульнях у Атланце Наталля Сазановіч. Яна ж увайшла ў дзесятку мацнейшых спартсменаў мінулага года і Рэспублікі Беларусь.

**(Наш кар.)**

*Усміхніцеся*

### Падслуханыя дыялогі

*Студэнт.* -- Прафесар, скажыце, кім мне лепш быць пасля заканчэння інстытута?

*Прафесар.* -- Заставацца самім сабой.

***

*Студэнт.* -- Прафесар, скажыце, ці варта мне займацца навукай?

*Прафесар.* -- Думаю, што не!

*Студэнт.* -- А чаму?

*Прафесар.* -- Ды таму, што тыя, хто хоча займацца навукай, аб гэтым не пытаюць.

***

*В.* -- Я даў сабе абяцанне, што буду публікаваць толькі выдатныя работы.

*А.* -- І колькі ж вы апублікавалі такіх работ?

*В.* -- Пакуль ніводнай.

***

*Студэнт.* -- Чаму вы паставілі мне "2"?

*Прафесар.* -- А ты думаеш, што "1" лепш?

***

-- Мне не зусім спадабаўся ваш адказ, -- сказаў прафесар студэнтцы.

-- Гэта таму, што мне з самага пачатку не спадабалася ваша пытанне, -- адказала тая.

### Бясшумная лаянка

Сямейныя сваркі прыносяць шмат няэручнасцей суседзям, нярвуюць дзяцей. Цяпер гэтаму будзе пакладзены канец. У магазіне ў продажу з'явіліся камплекты "Бясшумная лаянка" -- наборы картак з непрыстойнымі словамі і абразамі. Цяпер муж і жонка змогуць сядзець за сталом і бясшумна прад'яўляць адзін аднаму карткі па свайму выбару, а сварка знешне нагадвае гульню ў падкіднога дурня.

### Стракатыя думкі

Кожны "піша" сваё жыццё пад дыктоўку часу.

***

Усё жыццё шукаў зарыты ў маладосці талент.

***

Няхай гады бяруць сваё -- толькі б пакідалі нам вопыт і веды.

***

За душой нічога не меў, але ахвотна дзяліўся вопытам, як гэтага дасягнуў.

***

У гучных фразах нячутна слоў.

***

Гумар і сатыра падобны на лякарства: галоўнае ў іх -- мера.



*ЗІМОВАЕ РАЗДОЛЛЕ.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- матэматычных праблем кіравання -- асістэнта;

-- аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі -- асістэнта;

-- філасофіі -- старшага выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць па адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

**ДА ЎВАГІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ!**

Бухгалтэрыя універсітэта патрабуе неадкладна аднавіць у домакіраўніцтвах і прадставіць неабходныя даведкі для выплаты чарнобыльскіх надбавак.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 40.
Падпісана да друку 7.02.97.